*І. В. Грабянчук*
(Беларусь, Бабруйск)

# ФАРМІРАВАННЕ ПРАФЕСІЙНАЙ КАМПЕТЭНТНАСЦІ СТУДЭНТАЎ БАБРУЙСКАГА НАСТАЎНІЦКАГА ІНСТЫТУТА (1949–1954)

Дзейнасць Бабруйскага настаўніцкага інстытута на сённяшні дзень мала даследавана. Апошняя публікацыя на гэту тэму – падборка дакументальных крыніц аб першай вышэйшай навучальнай установе ў Бабруйску [1]. У дадзеных тэзісах аналіз і аўтарскія высновы грунтуюцца на фактычных матэрыялах узгаданай публікацыі і шэрагу іншых дакументаў, якія захоўваюцца ў Бабруйскім дзяржаўным занальным архіве [2].

Складанасці з фарміраваннем прафесійнай кампетэнтнасці студэнтаў Бабруйскага настаўніцкага інстытута пачыналіся яшчэ на стадыі ўступных экзаменаў і першых заняткаў. Значная частка абітурыентаў прадстаўляла атэстаты з невысокімі адзнакамі па ўсіх прадметах на ўсіх аддзяленнях – беларускай мовы і літаратуры, рускай мовы і літаратуры, а таксама фізіка-матэматычным. Уступныя экзамены, заняткі ў першым семестры выяўлялі ў першакурснікаў недасткова развітую вусную і пісьмовую мову, невысокую арфаграфічную пісьменнасць, слабыя практычныя навыкі ў рашэнні матэматычных задач, няўменне самастойна працаваць з кнігай.

У справаздачы Бабруйскага настаўніцкага інстытута за 1951/1952 навучальным годзе было прама сказана, што «… у інстытут паступаюць асобы з недастатковай акадэмічнай падрыхтоўкай і практычнымі навыкамі, паступаюць тыя, хто не можа ўладкавацца ў іншыя ВНУ. Зніжаць жа патрабаванні пры паступленні нельга, паколькі вучэбныя планы настаўніцкага інстытута перагружаны, а навучэнцы з слабай падрыхтоўка няздольныя пры двухгадовым тэрміне навучання справіцца з пастаўленай задачай». Адзначым, што больш за ўсё слабападрыхтаваных абітурыентаў трапляла на беларускае аддзяленне. Каб выправіць сітуацыю, арганізоўваліся заняткі па практычным курсе школьнай граматыкі і паўтарэнні асноўных раздзелаў матэматыкі за курс сярэдняй школы. Толькі пасля такога паўтарэння значная частка студэнтаў магла пачаць засваенне праграм настаўніцкага інстытута.

Перагружанасць студэнтаў навучальнымі заняткамі была звычайнай справай. Асабліва цяжка было першакурснікам у пачатку навучальнага года: пасля вяртання з традыцыйнай уборкі бульбы ў калгасе яны займаліся па 8, а ў некаторыя дні і па 10 гадзін. Дададзім да гэтага недастатковую ўкамплектаванасць інстытуцкай бібліятэкі

неабходнай літаратурай, складаныя побытавыя ўмовы ў студэнцкім інтэрнаце, шматлікія патрабаванні па выкананні грамадскай працы, якія забіралі ў студэнтаў нямала часу.

Вучэбны працэс зведаў моцны ідэалагічны дыктат з боку камуністычнай партыі і дзяржавы. У 1951/1952 навучальным годзе ў аснову ўсёй вучэбнай работы былі пакладзены «геніяльныя працы» І. Сталіна па пытаннях мовазнаўства і ўказанні ЦК УКП(б) і ЦК КП(б)Б па пытаннях паляпшэння выкладання грамадскіх навук у ВНУ і пастановы ЦК ВКП(б) па ідэалагічных пытаннях. Гэтыя ўказанні служылі асноўным крытэрыем у пытанні арганізацыі ўсяго навучальнага працэсу ў інстытуце. Галоўнай мэтай стала ўкараненне марксізму ва ўсе курсы, якія чытаюцца, лекцыі і семінарскія заняткі. Такім чынам, тут выразна бачыцца прыярытэт ідэалогіі перад прафесійнай кампетэнтнасцю.

У той жа час нельга сказаць, што фарміраванне прафесіннай кампетэнтнасці студэнтаў было занядбана. Дзейнічала некалькі навукова-даследчых студэнцкіх гурткоў. Напрыклад, дыялекталагічны гурток пры кафедры рускай і беларускай моў займаўся зборам матэрыялаў для складання дыялекталагічнага атласа Беларускай ССР. Гэта праца каардынавалася Акадэміяй навук БССР. Студэнты гуртка ўдзельнічалі ў экспедыцыях па вывучэнні беларускіх гаворак жыхароў населеных пунктаў Бабруйскага, Кіраўскага, Клічаўскага, Любаньскага, Парыцкага раёнаў. Яны сабралі багаты матэрыял не толькі па дыялекталогіі, але і па этнаграфіі, высветлілі і запісалі гісторыю ўзнікнення некаторых вёсак.

У цэлым студэнты Бабруйскага настаўніцкага інстытута паспяхова асвойвалі абраныя спецыяльнасці. Абсалютная большасць з іх здавала экзаменацыйныя сесіі, колькасць адлічаных была невялікая. Сфарміраванасць жа асноўных прафесійных кампетэнцый правяралася падчас педагагічнай практыкі, якая праводзілася на другім курсе ў лютым-сакавіку. Яе вынікі рэгулярна абмяркоўваліся на пашыраных пасяджэннях Рады інстытута з удзелам прадстаўнікоў адміністрацыі і настаўнікаў бабруйскіх школ.

На такіх пасяджэннях адзначалася, што студэнты-практыканты сур᾽ёзна рыхтаваліся да ўрокаў, глыбока і падрабязна выкладалі вучэбны матэрыял, вытрымлівалі ўсе неабходныя этапы ўрока, імкнучыся да максімальнага засваення школьнікамі ведаў. Настаўнікі школ заўважылі, што і вучні падчас педпрактыкі пачыналі больш актыўна рыхтавацца да заняткаў. У той жа час некаторыя кіраўнікі школ неахвотна бралі студэнтаў на практыку, непакоячыся, што гэта справа зменшыць якасць навучальнага працэсу. Студэнты Бабруйскага настаўніцкага інстытута на справе даказалі неабгрунтаванасць такіх засцярог.

Сярод недахопаў педпрактыкі адзначалі недастатковае знаёмства студэнтаў з працай класных кіраўнікоў, падыходамі да яе планавання. Студэнты не паспявалі ў поўным аб'ёме пазнаёміцца з правіламі вядзення ўсёй школьнай дакументацыі. Правядзенне толькі двух пазакласных мерапрыемстваў за ўсю практыку настаўнікі лічылі недастковай умовай для фарміравання адпаведных педагагічных кампетэнцый. У час педпрактыкі высветлілася, што студэнты недастакова сочаць за навінкамі метадычнай літаратуры, ім неабходна фарміраваць навыкі падрабязнага аналізу урокаў. Асноўным жа недахопам педпрактыкі была перагрузка школ практыкантамі і выкладчыкаў-метадыстаў – студэнтамі.

За пяць гадоў працы інстытут прадрыхтаваў і выпусціў 815 настаўнікаў мовы і літаратуры (беларускай і рускай), фізікі і матэматыкі для працы ў 5–7 класах сямігадовай сярэдняй школы. 102 чалавекі атрымалі дыплом з адзнакай. У спісах выпускнікоў ёсць пазнакі, што некаторыя з іх могуць выкладаць і ў 8–10-х класах сярэдняй школы. Такое права атрымоўвалі найбольш падрыхтаваныя маладыя спецыялісты, якія скончылі дадатковыя кароткатэрміновыя курсы.

Пасля атрымання дыпломаў настаўнікаў выпускнікі Беларускага настаўніцкага інстытута не гублялі сувязі з сваёй Alma mater. У сярэдзіне чэрвеня інстытут ладзіў традыцыйныя сустрэчы з усімі сваімі выпускнікамі. 12 лістапада 1953 г. на пасяджэнні Рады інстытута быў зацверджаны план працы з выпускнікамі. Ён прадугледжваў анкетаванне выпускнікоў, каб выявіць станоўчыя і адмоўныя бакі іх працы, арганізацыю лекторыя па метадычных і тэарэтычных пытаннях, падтрыманне пастаянных кантактаў з дырэктарамі школ, загадчыкамі раённых, гарадскіх і абласных аддзелаў народнай адукацыі з мэтай вывучэння і абагульнення працы настаўнікаў, якія атрымалі адукацыю ў Бабруйску [1, с. 34].

Такім чынам, працэс станаўлення прафесійнай кампетэнтнасці студэнтаў Бабруйскага настаўніцкага інстытута быў дастаткова складаным. Нягледзячы на ўсе цяжкасці, студэнты выявілі вялікае жаданне вучыцца і паспявалі ў цэлым сфарміравацца як маладыя спецыялісты за два гады навучання. Па сутнасці, яны атрымоўвалі незавершаную вышэйшую адукацыю, і таму ў іх быў стымул і перспектывы для далейшага прафесійнага росту, напрыклад, пастуніць у педагагічныя інстытуты, дзе тэрмін навучання быў разлічаны на чатыры гады. Бабруйскі настаўніцкі інстытут садзейнічаў сваім выпускнікам у гэтай справе. На жаль, многія планы не былі рэалізаваныя па прычыне закрыцця першай ВНУ ў Бабруйску ў ліпені 1954 г.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Грабянчук, І. В.* Бабруйскі настаўніцкі інстытут: хроніка дзейнасці першай ВНУ ў Бабруйску (1949–1954 гг.) / І. В. Грабянчук // Навуковыя працы кафедры грамадскіх дысцыплін і права Бабруйскага філіяла УА «БДЭУ» / пад навук. рэд. А. М. Ненадаўца. – Чарнігаў, 2014. – Вып. 2. – С. 5–52.
2. Бабруйскі дзяржаўны занальны архіў. – Фонд 1170. – Воп. 1. – Спр. 2, 10, 19, 32, 48: гадавыя справаздачы Бабруйскага настаўніцкага інстытута; спр. 3, 20, 33, 47: пратаколы пасяджэнняў Рады інстытута.

*Д. И. Дадеркина*
(Беларусь, Бобруйск)

## МАЛЫЙ АГРОБИЗНЕС В РЕСПУБЛИКЕ БЕЛАРУСЬ И ФАКТОРЫ, ВЛИЯЮЩИЕ НА ЕГО ФУНКЦИОНИРОВАНИЕ

В Республике Беларусь большое внимание уделяется развитию малого бизнеса, в том числе и в сельской местности. Как правило, под малым бизнесом понимают развитие торговли, услуг, агро-экотуризма, придорожного сервиса, открытие производств. К сожалению, при этом редко упоминается фермерство.

По нашему убеждению, основной формой малого бизнеса в сельской местности должен стать агробизнес в форме крестьянского (фермерского) хозяйства. Этот вид деятельности многогранен и понятен для сельского населения.

В Республике Беларусь числится 2261 крестьянское (фермерское) хозяйство. Средняя численность работников в крестьянских (фермерских) хозяйствах за 2008–2011 гг. выросла с 5951 до 7783 человек. Это лишь 0,98 % от средней численности работников в организациях малого бизнеса [3–6].

Фермерские хозяйства специализируются преимущественно на производстве продукции растениеводства. Так, в 2011 г. продукция растениеводства составила 634,8 млрд рублей (89 %), а продукция животноводства – 78,9 млрд рублей (11 %) [3–6].

Крестьянские (фермерские) хозяйства владеют 1 % сельскохозяйственных угодий, поэтому и в общем объеме производства сельскохозяйственной продукции их доля невелика. Так, удельный вес продукции крестьянских хозяйств в 2009 г. составил 0,8 %, в 2010 г. – 1,0 %, в 2011 г. – 1,3 %. Объемы производства продукции животноводства в общем объеме производства на протяжении последних трех лет оставались неизменными и составляли 0,3 %. Однако следует отметить, что крестьянские хозяйства производят 12,5 % овощей и 3 % картофеля [3–6].



БДЭУ Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт. Бібліятэка.
БГЭУ Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.
BSEU Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by elib@bseu.by